ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
ДЗЕДЗІЧ
Дзедзіч. Зберагчы і памятаць
Для Бацькаўшчыны-маці буду йграць.
(Янка КУПАЛА)
№ 1 (32)
ЛЮТЫ 2005

2 ЦІ ЁСЦЬ У ПРЭЗІДЭНЦКАЙ ВЕРТЫКАЛІ «ПАМАРАНЧВАЫ НАСТРОЙ»
4 НОВЫ ГОД У ЕЎРОПЕ сустрэлі прадстаўнікі моладзевых НДА
6 ДРАМАТУРГ, ЯКОГА МЫ ЗАБЫЛІ
8 ПАМАРАНЧАВУЮ РЭВАЛЮЦЫЮ ЗРАБІЛІ МУЗЫКАНТЫ

# СКАНДАЛ

## У ВІЦЕБСКУ УЛАДЫ ЗАГАДАЛІ ЗНЯЦЬ З ВЫСТАВЫ ПАРТРЭТ ВАСІЛЯ БЫКАВА, НАПІСАНЫ АЛЕСЕМ ПУШКІНЫМ



Мастак Алесь Пушкін быў адным з удзельнікаў пленэру, які праходзіў у жніўні ў вёсцы Бычкі, на радзіме Васіля Быкава. Да першай экспазыцыі, якую мастакі зладзілі ў Наваполацку ў снежні мінулага году, творы Алеся Пушкіна яшчэ не былі гатовыя, і ўпершыню яны былі паказаныя ў Віцебску.

Насамрэч партрэт Васіля Быкава, напісаны Алесем Пушкіным, віцебчукі маглі паглядзець усяго цягам двух дзён. На трэці дзень супрацоўніцы Цэнтру сучаснага мастацтва паспешна мянялі месцамі іншыя творы, каб не было бачна “дзіркі” у экспазыцыі.

Яны і распавялі, што нечакана тут з'явілася дырэктарка Цэнтру сучаснага мастацтва Валянціна Кірылава, якая, дарэчы, і адчыняла гэтую выставу, і загадала зняць партрэт ды схаваць, спаслаўшыся на нейкае распараджэнне аблвыканкаму.

Што ж ў гэтым партрэце было такога, што магло віцебскім уладам падацца крамолаю? Вось што пра свой твор распавядае сам Алесь Пушкін.

– Пабываўшы на радзіме Васіля Быкава, я доўга думаў, на якім фоне напісаць ягоны партрэт. І вырашыў так: возера, фермы пад чырвона-зялёнымі сцягамі, што “горда рэюць”… АМОН збівае дубінкамі дойны статак, а паміж гэтага статку, гэтых кароў, ёсць анёлы з бел-чырвона-белымі сцяжкамі. І жанчына з дзіцём уцякае да лесу – гэта вобраз той грамадскасці, што ўцякае цяпер за мяжу ад гэтага калгаснага фашызму, які апісваў Быкаў у сваіх апошніх аповесцях… І вось на фоне гэтага страшнага відовішча – сам Васіль Уладзіміравіч, ён адвярнуўся і ідзе прэч адтуль.

Даведаўшыся, што ягоную карціну знялі, Алесь Пушкін зазначыў, што нават не лічыць мэтазгодным прымаць нейкія тлумачэнні ад прадстаўнікоў уладаў. ¨н сказаў, што і так добра разумее, чым яны ў гэтым выпадку незадаволеныя:

– Гэта ж тыя самыя людзі, што ў 1995г. зачынілі першую прыватную галерэю сучаснага мастацтва “У Пушкіна”. Гэтыя людзі дагэтуль кіруюць культурай. А ўлада робіць адно – любую шчылінку затыкае. Бо ведае: калі не заткнуць шчылінку, то размые ўсю плаціну.

На знак пратэсту супраць забароны карціны Алеся Пушкіна іншыя ўдзельнікі Быкаўскага пленэру таксама адмовіліся экспанаваць свае творы ў Віцебску. Выстава пад назваю “Доўгая дарога дадому” зліквідаваная, і віцебчукі болей не ўбачаць ні апальнага “Партрэту Васіля Быкава”, ні іншых карцін беларускіх мастакоў.

Удзельнікі Быкаўскага мастацкага пленэру параўналі гэтую падзею з закрыццём беларускага Ліцэю ды Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту.

Паводле словаў мастака Міхася Ляўковіча, яны разам, супольна прыйшлі да высновы, што найбольш годна будзе зняць і свае карціны на знак пратэсту супраць чарговай праявы дзяржаўнага ўціску.

Дырэктарка Цэнтру сучаснага мастацтва Валянціна Кірылава так і не сказала, адкуль менавіта прыйшоў адпаведны загад. А гаворку пра зняты партрэт Васіля Быкава паспрабавала перавесці ў рэчышча мастацтвазнаўства:

– Я думаю, што творчыя намаганні Алеся Пушкіна маглі бы быць больш выразнымі, і я лічу, што над гэтым творам ён папрацаваў недастаткова. Як няма мастака, дык давай палітыку? Я лічу, што выставачная заля – гэта не месца для палітычных дэманстрацыяў.

– Гэта ваша прыватнае або афіцыйнае меркаванне?

– І прыватнае, і службовае!

На думку мастакоў, у той ці іншай ступені палітызаванымі можна лічыць усе карціны з гэтай выставы, бо яна прысвечаная Васілю Быкаву. Што да самога Алеся Пушкіна, то ён кажа, што ўдзячны сваім калегам за прынятае прынцыповае рашэнне, хаця і шкадуе пра тое, што віцебчукі ўжо не пабачаць многія добрыя мастацкія творы.

Спадарыня Кірылава таксама кажа, што шкадуе пра прынятае мастакамі рашэнне, якое пазбавіла людзей магчымасці наведаць выставу.

Аднак карціну Алеся Пушкіна яна забараніла нават фатаграфаваць, дый увогуле схавала яе так, што месца ейнага знаходжання не ведаюць нават супрацоўнікі выставачнай залі.

svaboda.org

## ШАНОЎНЫЯ БЕРАСЦЕЙЦЫ!

**– Калі Вы падзяляеце нашыя погляды на сучасную сітуацыю ў Беларусі і нашыя надзеі на будучыню,**

**– калі Вы жадаеце супрацоўнічаць з намі, стаць сябрамі "Сузор'я" ці проста перадаць цікавую інфармацыю,**

**паведамляем, што**
**звязацца з намі можна праз распаўсюджвальнікаў нашай газеты, альбо па тэл.: 23-68-02 з $13^{00}$ да $21^{00}$.**
**Маб.: (029) 660-57-41, (029) 725-15-39.**

## МЫ ЧАКАЕМ ВАС!

**Прэс-служба БАМГА "Сузор'е"**

## АДНЫМ РАДКОМ

### НАВІНЫ МОЛАДЗЕВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ – У ЭЛЕКТРОННАЙ РАССЫЛЦЫ

Фонд “Дзедзіч” распачаў выпуск электроннай рассылкі Dzedzich week-news з навінамі жыцця моладзевых арганізацый (МА) Берасцейшчыны. Таксама ў рассылцы змяшчаецца інфармацыя аб адукацыйных праграмах, семінарах, аб’явы аб конкурсах праектаў і стыпендый і, безумоўна, крыху гумару.

Просім усе МА дасылаць нам інфармацыю пра свае мерапрыемствы – былыя і плануемыя.

Падпісацца на рассылку можа любы жадаючы. А той, хто падпіша на рассылку 3 сваіх сяброў, атрымае падарунак – фірмовы каляндарык «Дзедзіча». Трэба толькі даслаць ліст на адрас: dzedzich@mail.ru і пазначыць свой e-mail.

**Dzedzich week-news**

### СТУДЕНТОВ ОБЯЗЫВАЮТ ПОДПИСЫВАТЬСЯ НА ГОСУДАРСТВЕННЫЕ ИЗДАНИЯ

Студентов Могилевского государственного педагогического университета, изучающих предмет «государственная идеология», обязывают подписаться на ряд государственных газет.

Начиная с этой сессии, студенты гуманитарных факультетов должны появляться на зачетах и экзаменах по этой дисциплине с квитанцией, которая бы подтверждала факт подписки. По информации службы мониторинга ОО «Белорусская ассоциация журналистов» по Могилевской области, существует устное распоряжение администрации педагогического университета на этот счет.

Будущие преподаватели истории и обществоведения должны будут подписаться на «Советскую Белоруссию» и "Магілёўскія ведамасці" – печатный орган облисполкома, сообщает БАЖ.

**charter97.org**

### МОЛАДЗЕВАЯ КАМІСІЯ ПАРТЫІ БНФ

**праводзіць у г. Берасці адукацыйны семінар для студэнтаў і выпускнікоў ВНУ**

**"КАНСЕРВАТЫЎНАЯ ІДЭЯ"**

**У праграме:**

– Існуючыя палітычныя ідэалогіі: камунізм, сацыял-дэмакратыя, лібералізм, хрысціянская-дэмакратыя, інш.
– Кансерватызм у свеце: гісторыя, каштоўнасці, палітычныя партыі кансерватыўнага накірунку.
– Кансерватызм у Беларусі: станаўленне, развіццё, перспектыва.
– Адкрытая дыскусія.

**Семінар адбудзецца 12 сакавіка (субота) з 10-00 да 17-00. Уваход вольны.**

Удзел у семінары бясплатны. Харчаванне падчас семінару – за кошт арганізатараў. Удзельнікі забяспечваюцца раздатачнымі матэрыяламі.

**Жадаючым узяць удзел у семінары неабходна загадзя патэлефанаваць па тэл.: (0162) 23-68-02.**

**Dzedzich week-news**

# "ОРАНЖЕВОЕ НЕБО"

## МНОГО ЛИ У НОМЕНКЛАТУРЫ "ОРАНЖЕВОГО" НАСТРОЕНИЯ?

**Представим себе, что во время президентской избирательной кампании в 2006 году или в каком-нибудь другом белорусская оппозиция сподобится-таки на свершение революции — по крайней мере, выведет на центральные улицы Минска хотя бы вожделенные сто тысяч человек. Тогда очень многое в ответных действиях президента будет зависеть от настроений и телодвижений номенклатуры.**

Сплотятся чиновники вокруг главы государства — революция или будет брутально подавлена, или сойдет на нет сама. Побегут как крысы с тонущего корабля, законтактируют публично или закулисно с оппозицией, пускай даже если возьмут подчеркнутый нейтралитет — президент наверняка будет вынужден как минимум идти на уступки и делиться властью, чтобы вовсе ее не потерять.

Не случайно ведь, назначая в конце 2004 года новым главой Администрации президента Виктора Шеймана, Александр Лукашенко особое внимание уделил задаче по укреплению органов власти — чтобы революционные политтехнологии не смогли завербовать в ряды оппозиции чиновников.

И не случайно он уже не раз вдогонку недавним "оранжевым" событиям в Украине заявлял, что ничего подобного в Беларуси не произойдет, что власть сохранит стабильность. Главное для Лукашенко — чтобы народ продолжал выбирать именно эту политико-социально-экономическую ценность, эволюционные, косметические трансформации, а не революционные перемены. Или на худой конец, чтобы электоральное недовольство оставалось тихим и не выливалось на улицы.

Ставить свою политическую судьбу в зависимость от чиновничьих настроений для президента чревато: нынешняя внешняя преданность в один миг может превратиться в предательство. И кстати, Лукашенко уже не раз давал понять номенклатуре, что достаточно недоверчиво относится к ее верноподданическим позам.

«Хочу заверить: лимит войн и революций наша страна, поколения, которые живут в нашем государстве, исчерпали. Прошу это запомнить и к этой теме не возвращаться. В Беларуси никаких "розовых", "оранжевых" или "банановых" революций не будет", — заявил Лукашенко, например, 7 января на православное Рождество.

Политолог Юрий Дракохруст отмечает два ключевых момента в этих рождественских высказываниях Лукашенко, рассчитанных на электорат. Во-первых, президент продолжает, как и перед референдумом, много говорить о ценностях стабильности, противопоставляя ее революции как источнику хаоса, анархии и опасности. Во-вторых, эксперт "Белорусских новостей" обращает внимание на неслучайное, на его взгляд, употребление словосочетания "банановая революция". Подтекст таков: "банановые революции" возможны в "банановых республиках", но Беларусь — не марионеточное, а по-настоящему независимое государство, в котором западные сценарии не пройдут.

А вот номенклатуру сменой власти Александр Лукашенко не пугает. Хотя в 2001 году, перед президентскими выборами, он стращал чиновников: мол, вот дорвется оппозиция до власти — мало не покажется. Сейчас ничего подобного не заявляется. По мнению Юрия Дракохруста, президент понимает, что эффекта это не даст — номенклатура весьма спокойно относится к перспективе перемен.

Ну, во-первых, чиновник конъюнктурен как таковой. Во-вторых, эксперт "Белорусских новостей" обращает внимание на конструкцию белорусской элиты. По его словам, она значительно отличается от украинской.

По мнению Юрия Дракохруста, "Кучма был первым среди равных, лидером партии власти. В Беларуси же система власти намного вертикальнее".

В Украине многие представители властной верхушки и бизнес-элиты держались Кучмы и Януковича, потому что они имели от этого режима некие преференции. Революция была чревата для них большими рисками и потерями.

У нас такой олигархической модели нет. И белорусская номенклатура, быть может, за редким исключением, не считает себя связанной с президентом до конца. В определенном смысле ей нечего терять, кроме своих цепей. Поэтому процесс перехода белорусских чиновников во время гипотетической революции на сторону оппозиции может быть куда более активным, чем это было в пору "оранжевой" революции в Украине.

**naviny.by**

## ЦЫТАТА МЕСЯЦА

***«Фильм "9/11 по Фаренгейту" широко демонстрировался в США. При этом ничего не предпринималось для того, чтобы предотвратить показ. ... Режиссер этого фильма не арестован, не посажен в тюрьму, против него не были выдвинуты какие-либо обвинения. Он смог свободно сделать свое кино и показать его по телевидению».***

**Джордж Крол, посол США в Республике Беларусь**



# ТРАУР С ЛИЦОМ НЕКРОФИЛИИ

**В НЕКОТОРЫХ КУЛЬТАХ АФРИКАНСКИХ НАРОДОВ РЕЛИГИОЗНЫЕ ОБРЯДЫ ПРЕДУСМАТРИВАЮТ ПРОЦЕСС СОВОКУПЛЕНИЯ С МЕРТВЫМИ, ПРОЩЕ ГОВОРЯ, В КУЛЬТ ВХОДЯТ ЭЛЕМЕНТЫ НЕКРОФИЛИИ. У СЛАВЯНСКИХ НАРОДОВ, КАК И У НАРОДОВ ВСЕЙ ЦИВИЛИЗОВАННОЙ ЕВРОПЫ, НЕКРОФИЛИЯ ВСЕГДА СЧИТАЛАСЬ ЧЕМ-ТО АМОРАЛЬНЫМ, НЕЕСТЕСТВЕННЫМ И НЕ СВОЙСТВЕННЫМ ЧЕЛОВЕЧЕСКОЙ НАТУРЕ.**

Людей с подобными склонностями издревле обвиняли в колдовстве, чернокнижии и путем сжигания на костре отправляли к их собратьям. В толерантной славянщине подобных одиозных личностей просто изгоняли из селений и городов.

XXI век внес свои изменения в трактовку сексуальной жизни человека – появились всевозможные би-, транс- и гомосексуалисты; изменилось и само отношение к культуре сексуальных отношений.

Таким образом, в результате всяческих новшеств и сексуальных революций, появилось сексуальное направление, которое своей бездушностью, аморальностью и скотским отношением к покойникам, превзошло некрофилию.

И называется эта извращенная сексуальная культура – политическая некрофилия.

Ярую приверженность к отношениям подобного толка все ярче и ярче демонстрирует нам телевидение (естественно, общее и национальное в одном лике) транслируя поучительные обращения А.Г.Л. к народу, парламенту и т.д. Если говорить откровенно, то склонность к вышеназванному пристрастию наблюдалась и раньше, только скрытая и очень схожая с политической проституцией. Достаточно вспомнить новогодние выступления, селекторные совещания и телевизионные послания, когда А.Г.Л. то заигрывал с Западом, давая клятвенные обещания выполнить-таки требования Декларации Прав Человека, то заискивал перед Россией, раскрывая с телеэкранов заговоры мирового капитализма во главе с НАТО.

Неоднократно в "гневных" выступлениях А.Г.Л. заявлял, что лозунгом оппозиции является: "Чем хуже – тем лучше". Еще учась в школе, в мою пору среди учителей бытовало мнение: "Каждый думает в меру своей распущенности".

Анализируя тексты посланий А.Г.Л., становится ясно, что слоган "Чем хуже…" является его подлинным девизом. Для того, чтобы убедиться в "распущенности" вышеназванной особы просто необходимо вспомнить слова о том, что "…Гибнут, становятся калеками ни в чем неповинные люди, женщины, дети… Каждый день приходят сообщения о гибели, захвате граждан государств…" (из обращения к белорусскому народу от 07.09.2004г.).

После событий 11 сентября 2001г. в США А.Г.Л. открыто паразитировал на факте отсутствия в стране взрывов, терактов и т.д. Причем, данное пристрастие наблюдается и у телевизионных холуев (можно просто – халтурщиков), которые в разнообразных контурах, взглядах в мир, особых мнениях и др. с нескрываемым удовольствием смакуют каждое происшествие в мире, прямо подпрыгивая от радости, что, мол, в Беларуси, хвала президенту, такого нет.

Отсюда следует вопрос: "Так кому все-таки лучше, когда где-то гибнут люди?"

Остатки сомнения в отношении пристрастия А.Г.Л. и его черни к политической некрофилии были отброшены совсем неожиданно. Как уже отмечалось выше, в своем послании к белорусскому народу от 07.09.2004 А.Г.Л. на фоне трагедии в Беслане, не стесняясь, занимался популяризацией своей особы, ставя себе в заслугу отсутствие подобных трагедий в Беларуси:


**Очередное новогоднее выступление...**

– ... И еще. Новый век принес новые угрозы, самая страшная из которых – терроризм… Мы (читайте: "Я" – прим. автора) уберегли свою страну от участия в международных авантюрах, которые хоть в малейшей степени ставили бы под угрозу Вашу жизнь и безопасность… И на референдуме Вы будете голосовать за безопасность страны, за жизнь и здоровье своих детей и внуков.

Ну, в общем, проголосовали: очередная элегантная победа единовыбранного и горячолюбимого президента, т.е. очередное продолжение демонстрации картин распущенного сексуального и аморального поведения на государственных телеканалах.

В завершение хотелось бы отметить, что все вышеописанное имеет субъективный характер, и является следствием длительных наблюдений за лукавыми спичами и посланиями, которые каждый вечер доносятся с телеэкранов БТ и ОНТ.

Можно прогнозировать, что по мере приближения к президентским выборам 2006г. поток пропагандисткой "лапши" усилится неимоверно. Ведь, как говорится, «пока сам себя не похвалишь, никто не похвалит», и люди просто могут забыть, благодаря кому они уже 11-й год живут в благополучной и стабильно процветающей Беларуси.

**П.Морозов**

## АДНЫМ РАДКОМ

### ЧОРНЫ СПІС

У інтэрнэце з'явіўся цікавы сайт: "Чорны спіс" (http://spisok.net) беларускіх чыноўнікаў, якія здзейснілі злачынствы на палітычную тэматыку. Любы чалавек, які валодае адпаведнай інфармацыяй, можа дапоўніць гэты спіс.

000000.000

Як паведамляюць аўтары сайта, гэты спіс створаны дзеля таго, каб беларускія грамадзяне і сусветная супольнасць ведалі імёны тых, хто сёння робіць зло, скіраваўшы атрыманую ўладу супраць свайго народа. Асноўная канцэпцыя сайта заключаецца ў тым, што кожны чалавек павінен разумець тое, што ён робіць. І калі мясцовы кіраўнік здзекваецца са свабоды слова, зачыняе газеты і забараняе выказваць сваё меркаванне – ён не можа далей быць кіраўніком.

– Калі міліцыянт збівае мірных дэманстрантаў, выконвае злачынныя загады свайго кіраўніцтва і хлусіць у судзе на палітычных працэсах – ён не дастойны быць міліцыянтам.

– Калі суддзя прыгаворвае людзей да арышту за ўдзел у мірных акцыях пратэсту і распаўсюд праўдзівай інфармацыі – ён далей не дастойны быць суддзёй.

– Калі кіраўнік мясцовай выбарчай кампаніі фальсіфікуе выбары, скажае волевыяўленне народа – ён не можа далей выконваць свае абавязкі.

– Калі кіраўнік дзяржавы захоплівае ўладу, правакуе фізічнае вынішчэнне сваіх апанентаў, адмаўляецца ад сваёй мовы ды культуры – ён не можа заставацца надалей кіраўніком дзяржавы.

Аўтары дадаюць, што інтэрнэт-старонка прызначана для таго, каб звярнуць увагу на правапарушэнні ў Беларусі і на тых асобаў, якія садзейнічаюць гэтаму. Таму спіс прызначаны для ўсіх зацікаўленых асобаў – супрацоўнікаў міжнародных структур, якія выдаюць візы і дазвол на выезд у свае краіны, праваахоўчых структур асобных дзяржаў і Інтэрпола, якія займаюцца пошукам міжнародных злачынцаў, а таксама для міжнародных судовых органаў, Гаагскага трыбуналу і СМІ.

Пакаранне за здзейсненныя злачынствы – непазбежна. Гэта павінен ведаць кожны!

**Dzedzich week-news**

### КУПЛЯЙ БЕЛАРУСКАЕ

Часопісы («Arche», «Дзеяслоў»), беларускія кнігі, якія не прадаюць у крамах, а таксама беларускамоўнае відэа ("Гладыятар", "Адважнае сэрца", "Матрыца", інш.) і музыка беларускіх выканаўцаў па нізкіх коштах. Гэта ўсё цяпер можна набыць у Берасці. Тэл.: (029) 727-44-83 (Андрусь).

**Dzedzich week-news**

**Шаноўныя сябры!**
**Рэдакцыя "Дзедзіча"**
**з задавальненнем прыме ад Вас бясплатныя прыватныя аб'явы ў наступны нумар бюлетэня, якія пабачыць свет у сярэдзіне сакавіка 2005 г.**
**Звяртайцеся па тэл.: (0162) 23-68-02 да 15.03.05.**

# НОВЫ ГОД У ЕЎРОПЕ

## СУСТРЭЛІ ПРАДСТАЎНІКІ МОЛАДЗЕВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ БЕРАСЦЯ

**З 28 СНЕЖНЯ ПА 4 СТУДЗЕНЯ Ў НАСУТАВЕ (ПОЛЬШЧА) ПРАЙШЛО ТРАДЫЦЫЙНАЕ МІЖНАРОДНАЕ СПАТКАННЕ "РАЗАМ У ЕЎРОПЕ", У ЯКІМ СЁЛЕТА БРАЛА ЎДЗЕЛ МОЛАДЗЬ З ПОЛЬШЧЫ, НЯМЕЧЧЫНЫ ДЫ БЕЛАРУСІ.**



**Як беларусы святкуюць каляды. Распавядае Марыя Есіна**

Арганізатар спаткання – Рэгіянальны Цэнтр Еўрапейскай Інфармацыі, адна з працоўных груп Фундацыі "Nowy Staw" (г. Люблін). Люблінскі Цэнтр Еўрапейскай Інфармацыі працуе з 1999г. і належыць да агульнапольскай сеткі інфармацыйных асяродкаў (у г. Люблін гэта новы партнер БАМГА "Сузор'е" – Фундацыя "Nowy Staw"). Цэнтр з'яўляецца асяродкам інфармавання і прапагандавання інфармацыі ў галіне еўрапейскай тэматыкі. Жыхары Любліна і Люблінскага ваяводства могуць атрымаць тут адказы на любыя пытанні, што датычаць Еўразвяза.

Мэтаю Цэнтра ёсць тлумачэнне розных аспектаў еўрапейскай інтэграцыі, звязаных са штотыднёвым жыццём, адукацыяй, культурай, прафесійнай працай. На базе Цэнтра працуе шэраг дасведчаных кансультантаў, ёсць уласная тэматычная бібліятэка. На працягу ўсяго часу дзейнасці Люблінскі Цэнтр Еўрапейскай Інфармацыі зрэалізаваў шмат праектаў, арганізаваў шэраг сустрэч і навучальных праграм. Дзейнасць цэнтра ахоплівае шмат тэмаў. Гэта інфармаванне пра Еўразвяз і ўмовы, на якіх у яго ўвайшла Польшча; трэнінгі на тэму Еўразвязу для вучняў, настаўнікаў, бібліятэкараў, валанцёраў, супрацоўнікаў урадавых службаў; сустрэчы кансультантаў Цэнтра з прадстаўнікамі лакальных груп люблінскай грамадскасці; канферэнцыі і дэбаты; конкурсы на тэму Еўра-звязу (напрыклад, "Мой рэгіён", "Мая Еўропа" і г.д.); "еўрапейскія" лекцыі ў пачатковай, базавай і сярэдняй школе і г.д. За сваю дзейнасць Цэнтр адзначаны шматлікімі дыпломамі, высокімі водгукамі.

Навагоднее спатканне "Разам у Еўропе", у якім, дарэчы, прадстаўнікі Беларусі ўзялі ўдзел першы раз, прайшло ў цёплай святочнай атмасферы Еўрапейскага Дома Спатканняў – асяродка яднання народаў і культур, пра які мы расказвалі ў мінулым нумары "Дзедзіча". Беларусь на сустрэчы прадстаўлялі сябры моладзевых арганізацый Берасця: БАМГА «Сузор'е», «Цэнтр роўнага навучання», студэнцкая ініцыятыва «Аазіс».

Праграмма сустрэчы, апроч дыскусій, у часе якіх кожны мог выказаць сваю ўласную думку наконт Еўразвяза і свайго месца ў ім, уключала цікавыя культурныя мерапрыемствы, экскурсіі, імпрэзы.

Асаблівай увагі заслугоўвае вечар нацыянальных традыцый, дзе группы з Беларусі, Польшчы і Нямеччыны прадставілі свае варыянты святкавання Раства і Новага Году ў народнай культуры, нацыянальныя стравы, песні, танцы. Прыемна, што прэзентацыя беларускай групы ў складзе сяброў "Дзедзіча" была адзінагалосна прызнана найлепшай. Беларуская медавуха, варэнікі, полька і традыцыйныя калядкі прыцягнулі найбольшую ўвагу мясцовай люблінскай тэлевізіі, якая рабіла фільм пра навагоднее спатканне еўрапейскай моладзі ў Насутаве.



**Падчас прэзентацыі нацыянальных традыцый. Беларусы таньчаць польку.**

Гэта зразумела, бо беларусы, на вялікі жаль, – рэдкія госці такога кшталту спатканняў. Удзельнікі і госці сустрэчы выказалі шчырую надзею на тое, што міжнародныя абмены моладзі з часам зоймуць прыярытэтнае месца ў дзяржаўнай палітыцы нашай краіны.

Вясёлымі і поўнымі ўражанняў былі экскурсіі па Любліне, наведванне мясцовага лядовага палаца, шматлікія сюрпрызы, падрыхтаваныя польскім бокам, і, безумоўна, навагодняя "міжнародная" імпрэза з танцамі ды конкурсамі.

Застаецца толькі спадзявацца, што ўзяць удзел у такім спатканні зможа калі-небудзь большасць беларускай вучнёўскай і студэнцкай моладзі, тым больш, што гэтага прагнем не толькі мы, але і аб'яднаная Еўропа. Але будзе гэта толькі тады, калі мы зразумеем, у якой частцы свету знаходзіцца Беларусь.

**Алена ДЗЕМІДЗЮК**



**Прэзентацыя нацыянальных страў. Варэнікі па-беларуску.**



**Workshop (майстэрня) – Еўропа ў маім уяўленні**

# РЭКЛАМА ПА-БЕЛАРУСКУ

## «ДЛЯ РЕКЛАМЫ БЕЛОРУССКИЙ ЯЗЫК БОЛЕЕ ЭЛИТАРНЫЙ, ЧЕМ РУССКИЙ»

**Как-то сидел на лекции и достал из кармана мобильник, чтобы прочесть эсэмэску. Сидящий возле меня парень, заметив телефон, воскликнул: "А! "Дакраніся да спакусы"! Знаю, знаю!.." Я поразился: парень-то, в принципе, русскоговорящий…**

**«Для рекламы белорусский язык более элитарный, чем русский», – уверяют топ-менеджеры ведущих западных компаний, которые “заговорили” на матчынай мове.**

### "ЭЛІТАРНАЯ МОВА – ЭЛІТАРНАЯ ПРАДУКЦЫЯ"

Чтобы "вывести на чистую воду" компанию «Самсунг», мы позвонили менеджеру по маркетингу Алене Ранцевич. Кстати, все менеджеры западных компаний, к кому мы обратились, свободно говорят на белорусском.

– Алена, вы не жалеете, что перешли в рекламе на белорусский язык? Какие были ваши аргументы "на карысць роднай мовы"?

– Несколько лет назад, взяв на себя всю ответственность, я предложила такой ход. В украинском представительстве, которому подчиняется и белорусское отделение "Самсунга", это восприняли нормально. Кстати, тамошние законы обязывают использовать в рекламе только украинский язык…

А белорусский язык сегодня более элитарный, чем русский. Моим главным доводом было "Элітарная мова – элітарная прадукцыя". "Пісьменна" им владеют люди интеллигентные, образованные. Да, раньше белорусский язык считался "моваю вёскі". Сегодня же, читая нашу белорусскую рекламу, вряд ли кому-то придет в голову мысль, что "Самсунг" у дзярэўню перабраўся"!.. Вскоре мы планируем добавить белорусский в меню наших телефонов…

### "ПО МАТЧЫНАЙ МОВЕ КЛИЕНТ УЗНАЕТ: МЫ РЯДОМ"

Вскоре после «Самсунга» в Минске появились рекламные доски с информацией на белорусском языке другой компании – «Панасоник». Мы позвонили менеджеру по региональному развитию Александру Белому и в лоб спросили:

**– Александр, скажите честно, это вы у «Самсунга» "сцыганілі"?..**

– Я давно вынашивал такую идею, но все не получалось довести ее до ума. Реклама наших конкурентов просто стала последней каплей.

**– Неужели не боитесь, что это создаст некий психологический барьер между вами и русскоязычными потенциальными покупателями?**

– Не думаю. Нашей задумкой было показать клиенту, что вот мы, здесь, рядом. А то, знаете, бывает: купит человек какую-нибудь вещь, возникнут с ней вопросы – и ищи после эту фирму где хочешь. Рекламная стратегия нашей компании направлена на имиджевую рекламу, а не на разовую. То есть, чем больше человек доверяет компании, тем приятнее результат для нас. Думаю, белорусский язык подчеркнет нашу уверенную позицию на белорусском рынке, стабильность и респектабельность компании. К тому же реклама на белорусском бросается в глаза и, следовательно, запоминается.

### МНЕНИЕ ЭКСПЕРТА

**Олег ТРУСОВ**, председатель Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны:

– Мне очень приятно, что коммерческие компании поняли "фишку" и преимущества использования "роднай мовы" – улыбается Олег Трусов. – Кто сам, кому мы подсказали… Поначалу некоторые иностранные компании отвечали нам, что раз два государственных языка, то и "не дурыце галаву". Мы же напоминали, что на последней переписи населения белорусами назвались около 87% жителей нашей страны, 37% заявили, что ежедневно говорят по-белорусски. Получив эти цифры, те же немцы моментально среагировали – это ведь язык 3,5 миллионов потенциальный клиентов!..

**– Ага, тогда почему не все рекламируются по-белорусски?**

– Я и сам задавался таким вопросом… Неужели, если написать на конфете "Чырвоны Каптурок" вместо "Красная Шапочка", никто не купит такую конфету?.. Ерунда! Как говорят, "абы смачна было"!

**– Примеров удачного использования мовы много?**

– Достаточно. Например, по-белорусски мы читаем на пельменях из Новгорода, макаронах из Смоленска, круассанах из Петербурга… К нам обратилась за "моўнай дапамогай" фирма "Дирол" – скоро и на их продукцию придет белорусский язык. С нами сотрудничает фабрика "Слодыч", минские хлебзаводы, завод "Крышталь", Клецкий молочный завод. Недавно получили ответ от компании "Майкрософт" о готовности включить наш язык в список "компьютерных языков". Это значит, скоро сможем видеть на экране своих компьютеров значки "Сметніца", "Мае дакуманты", "Мой кампутар"… ТБМ готово абсолютно бесплатно помочь с переводами любой фирме или предприятию.

### КТО ЕЩЕ ГОВОРИТ ПО-БЕЛОРУССКИ?

Все, наверное, встречали рекламу бутика "Хуга Бос", видели в магазине "шчотку для дагляду за абуткам "Дамавік", пробовали "курыны булён "Галіна Бланка", спасались от кашля леденцами "Бобс" (на бразильских конфетах по-белорусски указан состав). На белорусскую версию сайта компании "Велком" конкуренты из "МТС" ответили заявлением о вводе белорусского языка в интерфейсы телефонов. В прошлом году лицеисты-коласовцы обратились к руководству Минского метрополитена с просьбой давать объявления на станциях по-белорусски. Не знаю, совпадение ли это, но результат "на вуха".

Примеров масса. После того как на прошлогодние зимние праздники белорусскоязычных открыток на всех не хватило, "Белпошта" в предверии Нового года-2005 большую часть своей продукции оформила на мове…

### СУПЕРАКЦИЯ

Очаровавшись "моўными" веяниями белорусского бизнеса, "Комсомолка" объявила акцию. Всем предприятиям, которые будут использовать на своей продукции и рекламе белорусский язык, народный поэт Беларуси Рыгор Бородулин согласился помочь в "прыдумванні" названий, брэндов и слоганов (ясное дело, вершаваных!). А "Комсомолка" предоставляет скидку на всю беларускамоўную рекламу в газете. Ведь, как сказал дядька Рыгор, “Толькі беларускамоўнаю рэкламаю прапануецца лепшае самае!».

**«КП в Беларуси»**

ВНИМАНИЕ!

# ПРИГЛАШАЕМ ВОЛОНТЁРОВ

ДЛЯ ПОДДЕРЖКИ ЕДИНОГО КАНДИДАТА
ОТ ДЕМОКРАТИЧЕСКИХ СИЛ
НА ПРЕЗИДЕНТСКИХ ВЫБОРАХ 2006г.

**– Вас не устраивает ситуация в стране, но вы верите, что её можно изменить;**
**– Вы устали верить обещаниям Лукашенко и поддерживаете демократическую оппозицию;**
**– Вы желаете внести свой вклад в возрождение независимой и процветающей Беларуси;**
**– Вам больше 18 лет, и вы можете посвятить часть своего времени избирательной кампании;**
**– Вы хотите приобрести навыки общения с людьми, умения убеждать, взглянуть на выборы изнутри: не как простой избиратель, а как активный участник событий –**

# НАМ НУЖНА ВАША ПОМОЩЬ!

**МЫ ОБЕЩАЕМ:**
**– проведение для вас образовательных семинаров, стажировок как в г. Бресте, так и в других городах и странах;**
**– обеспечение вас всеми необходимыми навыками ведения эффективной агитации;**
**– предоставление возможности продолжить свою политическую карьеру при нашей поддержке;**
**– создание дружеской атмосферы и знакомство с интересными людьми.**

**ЧТО МОЖНО ДЕЛАТЬ: сбор подписей, распространение листовок, расклейка плакатов, агитация, участие в создании предвыборной программы, наблюдение за выборами.**

**ЗВОНИТЕ НАМ В ЛЮБОЕ ВРЕМЯ ПО ТЕЛ:**
**23-68-02, (029) 660-57-41, (029) 725-15-39, 41-12-00.**

**Брестская городская организация Партии БНФ**

## ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

### 1 ЛЮТАГА

1 лютага 1863 г. – дзень пачатку антырасейскага паўстання, якое шырока вядома ў Беларусі як паўстанне **Кастуся Каліноўскага**. Літоўскі правінцыйны камітэт абвясціў сябе Часовым урадам на акупаваных Расейскай імперыяй землях Беларусі і Літвы. Быў прыняты маніфест аб пачатку паўстання і надзяленні сялян зямлёй.

### 4 ЛЮТАГА

У гэты дзень у 1746 г. нарадзіўся **Тадэвуш Касцюшка**. Поўнае імя ў яго было Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка, а прыйшоў ён на свет у



фальварку Мерачоўшчына пад Івацэвічамі. Напэўна, у той лютаўскі дзень ніхто са сваякоў у самых смелых фантазіях не ўявіў бы, які лёс чакае гэтага хлапца з беларускага шляхецкага роду. А пачынаў Касцюшка сваю кар'еру па вайсковай лініі. Скончыў Варшаўскі кадэцкі корпус, наведваў заняткі ў Парыжскай вайсковай акадэміі, пасля добраахвотнікам пайшоў на вайну за незалежнасць ЗША, стаў сябрам прэзідэнта Томаса Джэферсана. У 1784 г. Касцюшка вярнуўся на радзіму і тут узначаліў антырасейскае паўстанне 1794 г. Федэратыўная дзяржава Рэч Паспалітая была падзеленая паміж імперыямі. Наш край дастаўся Расеі. Супраць гэтай акупацыі і ўзнялося паўстанне на чале з Касцюшкам. У бітве пад Рацлавіцамі Касцюшкава войска разбіла расейскую армію. А ў бітве пад Мацяёвіцамі Касцюшка быў цяжка паранены і трапіў да расейцаў у палон. Патаемна, пад чужым прозвішчам "шляхціч Шымански" яго перавезлі ў Петрапаўлаўскую крэпасць. Пасля вызвалення мужны змагар зноў пабываў у ЗША, а пасля вярнуўся ў Еўропу. Памёр ён у 1917 г. у Швейцарыі.

Варта адзначыць, што беларускія ўлады летась аднавілі сядзібу Касцюшкі ў Мерачоўшчыне. Частку фінансавых выдаткаў пакрыла амбасада ЗША ў Беларусі, частку выдзяліў Берасцейскі аблвыканкам. Польскія ўлады, якія ўважаюць Т.Касцюшку за свайго нацыянальнага героя, ніякага ўдзелу ў аднаўленні сядзібы не прынялі.

4 лютага 1808 г., у фальфарку Панюшкавічы пад Бабруйскам нарадзіўся **Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч**, творы якога ўсе ведаюць са школьнай праграмы. Дунін-Марцінкевіч – першы прафесійны пісьменнік, які пісаў па-беларуску. Справа ў тым, што іншыя літаратары таго часу ў нашым краі хоць і карысталіся ў побыце беларускай мовай, але пісалі пераважна па-польску, як, да прыкладу, Адам Міцкевіч або Ян Чачот. Пісанае па-беларуску лічылася забавай або этнаграфізмам. І паэты, якія хацелі зрабіць прафесійную літаратурную кар'еру, выбіралі польскую мову. Патрабавалася пэўная адвага, каб стаць прызнаным пісьменнікам, творачы па-беларуску. Бо найперш трэба было сцвердзіць права на існаванне ў літаратуры самой мовы, а тады ўжо паказаць свой талент. Вось жа Дуніну-Марцінкевічу такой адвагі хапіла. Ужо следам за ім, гледзячы на ягоны ўдалы прыклад, пачнуць пісаць па-беларуску і іншыя.

## ВЯРТАННЕ МАЎКЛІВАЯ СПОВЕДЗЬ

# ДРАМАТУРГ, ЯКОГА МЫ ЗАБЫЛІ

**ЯКОЕ ІМЯ ЎЗНІКАЕ Ў НАШАЙ СВЯДОМАСЦІ, КАЛІ ВЫМАЎЛЯЕМ СЛОВАЗЛУЧЭННЕ "НАЙЗНАЧНЕЙШЫ ДРАМАТУРГ БЕЛАРУСКІ"? АНДРЭЯ МАКАЁНКА? КАНДРАТА КРАПІВЫ? ЯНКІ КУПАЛЫ?**

Што і казаць, гэтым людзям сапраўды належыць пачэснае месца на драматургічным Парнасе, аднак першынство без сумневу трэба аддаць адной з найбольш спрэчных і табуяваных постацей беларускай драматургіі – Францішку Аляхновічу.



Аляхновіч, на жаль, дагэтуль слаба вядомы вялікай частцы нашага грамадства, у адрозненне, прыкладам, хоць бы ад Кандрата Крапівы, чыё імя ўспомніць ці не кожны чалавек з сярэдняй адукацыяй. А між іншым, гэта постаць таленавітая і шматгранная: драматург, рэжысёр, акцёр, дырэктар трупы і тэатру, першы гісторык беларускага тэатру, эсэіст, аўтар аднаго з першых сведчанняў пра савецкія канцэнтрацыйныя лагеры, выдавец часопісаў і газет...

Кантэкст, у якім Аляхновіч пачынае свае першыя крокі ў якасці драматычнага акцёра і рэжысёра быў выключна складаны і нават канфліктны. Заангажаваны ў нацыянальны адраджэнскі рух яшчэ з 1910 г. ён адным з першых ясна сфармуляваў палітычныя мэты тэатральнай дзейнасці ў Беларусі (у прыватнасці, у артыкуле "Беларускі тэатар (1910-1920)" і ў гістарычнай працы з той самай назваю). У тыя часы беларускі тэатр быў не проста месцам адпачынку, ён быў найперш пашыральнікам ідэй беларускага адраджэнскага руху, часткай якога быў Аляхновіч.

> ***Як сыфілітычныя сьпірохэты ў варганізьме, гэтак залазіць ў душы паганая бальшавіцкая атрута. Няхай мае словы, словы "попутчіка", аздараўляюць гэтых бедных духам людзей. Няхай вучацца на маім прыкладзэ. Бо ні Тарашкевіч, ні Рак-Міхайлоўскі, ні Гаўрылкін, ні Дварчанін - ды й ня пералічыш іх усіх, нічога вам ня скажуць. Адны з гэтых няшчасных, неразумных гніюць ўжо ў зямлі, іншыя - у концлягерах або вастрогах.***
>
> ***Мне пашанцавала. Я шчэ жыву. Я на волі. Я магу яшчэ трымаць пяро ў руцэ.***
>
> **Францішак АЛЯХНОВІЧ**

Жыццёвы шлях Аляхновіча быў пакручасты. Нярэдка даводзілася ратаваць свабоду і жыццё уцёкамі (у Аўстра-Венгрыю з царскай Расіі, праз колькі дзесяткаў год – ужо ў Літву ад бальшавікоў), давялося яму і пабываць "У капцюрох ГПУ" (аднайменная аўтабіяграфічная кніжка ўспамінаў аб гэтым перыядзе ягонага жыцця амаль адразу разышлася на некалькіх еўрапейскіх мовах), цудам вырваўшыся з іх (быў абменены на Браніслава Тарашкевіча). Але ніколі (хіба толькі ў часе быцця ў лагерах) ён не пакідаў пісаць.

Ягоныя п'есы сапраўды стаяць на самым высокім мастацкім узроўні. Займальны і цікавы сюжэт, відовішчнасць, дынамічнасць даюць гэтым п'есам права лічыцца аднымі з найлепшых у беларускай літаратуры. У некаторых з іх, прыкладам, у "Няскончанай драме" (у нечым, дарэчы, аўтабіяграфічнай) ці камедыі "Пан міністар" зырка праяўляюцца палітычныя погляды аўтара.

Аляхновіч нарадзіўся ў Заходняй Беларусі і быў грамадзянінам Польшчы, дзеля гэтага пішучы такія п'есы ён мог не баяцца арышту савецкімі спецслужбамі.

На жаль, як працаўнік на ніве адраджэння, які паверыў у добрыя намеры бальшавікоў адносна беларушчыны, ён пераязджае ў Менск. За гэту жахлівую памылку ён заплаціў сямю гадамі, выкінутымі са свайго жыцця. Перажытае, аднак, лягло ў аснову ягонай славутай кнігі.

У часе нямецка-савецкай вайны немцы не заміналі беларускаму культурнаму жыццю. Гэтай парою Францішак Аляхновіч, не кідаючы працы ў беларускай драматургіі, рэдагуе выдаваную ў Вільні газету "Bielaruski Holas".

Гэты апошні факт відаць і стаў канчатковаю прычынаю таго, што пра творчую спадчыну Аляхновіча ў часы БССР "забыліся". Амнэзія гэтая была выкліканая яшчэ і зместам п'есаў. Немагчыма ўявіць сабе, прыкладам, п'есу "Пан міністар" (дарэчы блізкую па тэматыцы да забароненых Купалавых "Тутэйшых"), ці тую ж "Няскончаную драму", пастаўленымі ў савецкім тэатры – занадта моцны ў іх імпульс "буржуазнага нацыяналізму" дый замала ў іх сацрэалізму.

Дзякуй Богу ўжо даўно ляснуўся Савецкі Саюз і імёны, доўгі час сціраныя з памяці народа зноў вяртаюцца. Творы Геніюш, Арсенневай, Аляхновіча, табуяваныя савецкай культурай сталі даступныя шырокаму колу чытароў. Шкада, што ў школе іх творы ўсё яшчэ не допускаюцца да вывучэння беларускімі дзецьмі. А гэта ж частка нашай культуры, яе мы маем шанаваць і вывучаць, пазбаўляючыся як найхутчэй застарэлых савецкіх фобій і стэрэатыпаў мыслення і светаўспрымання.

**Андрэй МАТУСЕВІЧ**

*Ад прадзедаў спакон вякоў нам засталася спадчына... (Я. Купала)*

# ДЗЕНЬ АБАРОНЦАЎ АЙЧЫНЫ

## 23 ЛЮТАГА ЦІ 8 ВЕРАСНЯ?

**У НОЧ З 7 НА 8 ВЕРАСНЯ 1514 ГОДА НАСУПРАЦЬ СТАНУ МАСКОЎЦАЎ ПАЧАЛІ ШЫХТАВАЦЦА ТАЕМНА ПЕРАЙШОЎШЫЯ КАГАДЗЕ РЭЧКУ КРАПІЎНУ ПАЛКІ ГЕТМАНА КАСТАНЦІНА АСТРОЖСКАГА – НАЗАЎТРА ІМ СУДЖАНА БЫЛО НАЗАЎСЁДЫ УВАЙСЦІ У ГІСТОРЫЮ ЯК ПЕРАМОЖЦАМ У ВЯЛІКАЙ БІТВЕ, ЯКАЯ ЗБЕРАГЛАСЯ Ў ПАМЯЦІ НАШЧАДКАЎ ЯК "БІТВА ПАД ВОРШАЙ".**

Гэта бітва стала кульмінацыйным пунктам у пачатай на схіле 1512г. Масквой чарговай вайне за нашыя землі.

На досвітку маскоўскія ваяводы Чаляднін і Булгакаў павялі палкі ў першую атаку. Дрэнную службу ваяводам саслужыла самаўпэўненасць – яны мелі амаль трохразовую перавагу (80 тысяч супраць 30) і кепска ўзаемадзейнічалі, нават не лічачы патрэбным дапамагаць адзін аднаму. Спроба абыйсці наша войска і наляцець з тылу не ўдалася, і пасля паўдня маскоўскія ваяводы кінулі на праціўніка галоўныя сілы. Конніца Астрожскага завагалася, спыніла націск, а потым і наогул пакацілася назад. Раптам яна знячэўку крута павярнула ўбок і расейская дваранская конніца апынулася перад пакінутымі ў засадзе гарматамі. Смяротны град артылерыі спыніў атаку. Конніца Астрожскага рассекла заваёўнікаў на часткі і рассеяла іх па шырокім прырэчным полі.




**План-схема бітвы пад Воршай**

Ворагаў гналі і seклі яшчэ пяць вёрстаў. Вада ў Крапіўне пачырванела ад крыві. Летапісы і хронікі паведамляюць, што маскоўская раць страціла забітымі блізу 40 тысяч. Чаляднін, Булгакаў-Голіца і яшчэ восем ваяводаў трапілі ў палон. Разам з імі ў руках пераможцаў апынуліся дзве тысячы "дзяцей баярскіх" і тры тысячы шэраговых воінаў.

Бліскучая перамога аддала ініцыятыву вайны ў рукі Вялікага Княства Літоўскага. Усе захопленыя маскоўцамі гарады, апрача Смаленску, былі вызваленыя. Пачаў развальвацца накіраваны супраць Вялікага Княства Літоўскага і Польшчы таемны альянс Масковіі ды еўрапеўскіх дзяржаваў. Крымскія татары, уражаныя перамогаю пад Воршай, на два гады спынілі набегі на Княства і павярнулі сваіх коней у бок Масквы.

Пра выдатную перамогу, якой Астрожскі фактычна ўратаваў краіну ад чужынскага панавання, даведалася ўся Еўропа. ¨й быў прысвечаны спецыяльны лісток навінаў, выпушчаных ў Нюрнбэргу ў 1514г. Аршанская бітва ўвайшла ў еўрапейскія хрэстаматы з ваеннай гісторыі як узор удалай тактыкі змагання з нашмат пераважаючымі сіламі ворага.

Памяць пра слаўную перамогу ўвасобілася і ў старадаўняй беларускай народнай песні:

"...Масква стала наракаці,
Места Воршу пакідаці;
А як з Воршы уцякалі,
Рэчку невялічку пракліналі...

...Слава Воршы ўжо ня горша
Слаўся, пан Астроскі!"

Дзень 8 верасня, як дзень слаўнай перамогі, неафіцыйна святкуецца цяпер як Дзень беларускай вайсковай славы.

З гістарычныга гледзішча ёсць куды больш падставаў адзначаць менавіта гэты дзень, як дзень абаронцаў Айчыны, чым дзень "масавава влітья дабравольцэв в Красную Армію" – 23 лютага.

Дык святкуйма!

**Іван ПАНАСЮК**

## КАРЫКАТУРА АД WI




## ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

### 4 ЛЮТАГА

4 лютага 1931 г. скончыў жыццё самагубствам **Усевалад Ігнатоўскі**, беларускі гісторык, акадэмік. Ігнатоўскі займаў у Беларусі важныя дзяржаўныя пасады ў часы савецкай беларусізацыі 20-х гадоў. Але на пачатку 30-х гэтай беларусізацыі прыйшоў канец. Ігнатоўскага сталі публічна называць лідэрам нацыянал-дэмакратычнай контррэвалюцыі і кулацкім агентам, пача-лiся выклікі на допыты ў ГПУ. Каб усяго гэтага не чуць і не бачыць, шанаваны ў краіне чалавек мусіў зрабіць сабе смерць.

### 15 ЛЮТАГА

15 лютага — **Грамніцы** або **Стрэчанне**. Земляробчае свята сустрэчы зімы і лета. Першая назва, як мяркуюць, пайшла ад паганскага бога Грамаўніка, які ўтварае вясновыя навальніцы і дажджы. Пасля гэтага дня зімовая ўлада мусіла скончацца. Людзі казалі: "На грамніцы – паўзіміцы" або "Як прыйдуць Грамніцы – скідай рукавіцы". Менавіта так гэтае свята называлася і адзначалася ў беларускай дахрысціянскай традыцыі. А другая назва – Стрэчанне – паходзіць ад царкоўнага "Срэцення", якое народ перакруціў на простае і зразумелае.

А ў нас сёння Стрэчанне, Стрэчанне,
Зіма з летам стрэлася, стрэлася,
Лета зіму піхнула, піхнула
І ножачку звіхнула, звіхнула.
Зіма пайшла плачучы, плачучы,
Лета пайшло скачучы, скачучы.

### 16 ЛЮТАГА



16 лютага 1757 г. у вёсцы Скокі цяперашняга Берасцейскага раёну нарадзіўся **Юльян Нямцэвіч** – слынны змагар і пісьменнік, ад'ютант Тадэвуша Касцюшкі. ¨н вучыўся ў Берасцейскім езуіцкім калегіуме, пасля – у Варшаўскім кадэцкім корпусе. У часе антырасейскага паўстання 1794 г. Нямцэвіч разам з Касцюшкам патрапіў у палон і быў зняволены ў Петрапаўлаўскай крэпасці. Пасля разам са сваім нязменным каман-дзірам Нямцэвіч выехаў на нейкі час у Амерыку. Вярнуўўшыся на Радзіму ён браў удзел у паўстанні 1831 году. Прызнаца, цяжкавата ўявіць сабе паўстанца, якому 74 гады. Тым не менш, пасля паразы паўстання Нямцэвіч выязджае ў эміграцыю, дзе цалкам прысвячае сябе літаратурнай дзейнасці, на што Бог падарыў яму яшчэ 10 плённых гадоў. Апроч раманаў, камедый і патрыятычных песен Юльян Нямцэвіч пісаў яшчэ і мемуары, у якіх перакazваў сваё надзвычай багатае жыццё і распавядаў пра прыгажосць сваёй Радзімы – Беларусі.

### 19 ЛЮТАГА

19 лютага 1918 г. ў Менску выканаўчы камітэт Усебеларускага з'езда стварыў **Народны сакратарыят** – часовы ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі. Пазней Народны сакратарыят быў перайменаваны ў Раду БНР. Узначальваў сакратарыят Язэп Варонка. А сённяшнюю Раду ачольвае Івонка Сурвіла, якая жыве ў Канадзе.

**ГІСТАРЫЧНЫ СЕКТАР**

# МУЗЫЧНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ

**У СТУДЗЕНІ СУСЕДНЯЯ УКРАІНА ПАДЫЙШЛА ДА ФІНАЛУ ПАМАРАНЧАВАЙ РЭВАЛЮЦЫІ: АДБЫЛАСЯ ЎРАЧЫСТАЯ ІНАЎГУРАЦЫЯ ВІКТАРА ЮШЧАНКІ – НОВАГА ПРЭЗІДЭНТА НЕЗАЛЕЖНАЙ УКРАІНЫ. ПАЛІТЫЧНЫЯ ДЫ ІНШЫЯ АСПЕКТЫ ГЭТАГА ЗДАРЭННЯ ПАКІНЕМ ДЛЯ РАЗГЛЯДУ СПЕЦЫЯЛІСТАМ У ГЭТЫХ ГАЛІНАХ, НАМ БЫ ХАЦЕЛАСЯ ЗАСЯРОДЗІЦЬ ВАШУ ЎВАГУ НА ІНШЫМ АСПЕКЦЕ "РЭВАЛЮЦЫІ" – МУЗЫЧНЫМ, ЯКІ З'ЯЎЛЯЕЦЦА СВОЕАСАБЛІВАЙ МУЗЫЧНАЙ ПАДТРЫМКАЙ КАНДЫДАТА.**

Трэба адзначыць, што менавіта музыка з'яўляецца тым фактарам, які сведчыць аб папулярнасці і прыхільным стаўленні да асобных ідэй або, у дадзеным выпадку, да асобных кандыдатаў.

Усе добра ведаюць, што вечары ды ночы на Майдане Незалежнасці праходзілі пад музычны акампанемент. Прыкладна ў такой самай форме, толькі менш стыхійнай і з меншым энтузіязмам праходзілі акцыі ў падтрымку іншага кандыдата – Віктара Януковіча.

Трэба адзначыць, што кандыдацкая кампанія Віктара Януковіча, якая была разгорнута на тэрыторыі Усходняй Украіны, цалкам паўтарала сцэнар прэзідэнцкай кампаніі Б.М. Ельцына, а таму і музычная падтрымка кандыдата Януковіча таксама адпавядала тагачасным ельцынскім прынцыпам ("Голосуй, а то проиграешь!") – г.зн. былі закуплены "другасортныя" расейскія музыкі, кшталту Кабзона ды іншай папсы, якія нават дакладна не ведалі: у падтрымку каго яны выступаюць.

Аб гэтым яскрава сведчыць выпадак, калі на канцэрце ў падтрымку Віктара Януковіча бацька скандальнага Філіпа Кіркорава – Бэдрас Кіркораў – двойчы абвясціў, што пераможцам павінен стаць Віктар Юшчанка. Такім чынам, мы сустракаемся з элементарнымі "наймітамі", якія выступалі пад "фанеру" у падтрымку свайго спонсара, а таму з'яўляюцца зусім нецікавымі для разгляду (прынамсі, такую карціну можна ўбачыць на любой значнай акцыі, скіраванай, скажам, на раскрутку якога-небудзь вытворцы піва або мыла).

Іншая сітуацыя назіралася ў сталіцы Украіны – Кіеве, калі дзесяткі як айчынных, так і замежных рок-гуртоў (Океан Эльзи, Воплі Відаплясава, NRM, Крамбамбуля) ды проста папулярных музыкаў (Руслана ды інш.) выступалі ў падтрымку Віктара Юшчанкі. Прычым гэтымі музыкамі выконваліся як даўно вядомыя ў краіне кампазіцыі, так і новыя, адмыслова напісаныя для "памаранчавай" рэвалюцыі творы.



Алег Скрыпка (Воплі Відаплясава) выступае на Майдане



Падчас святочнага канцэрту на Майдане



Апельсіны – сімвал памаранчавай рэвалюцыі

Да ліку апошніх, безумоўна, трэба аднесці кампазіцыі "Зустріч на Майдане" і "Разом нас багато!". Апошняя, дарэчы, стала своеасаблівым гімнам кампаніі Віктара Юшчанкі.

Песня "Разом нас багато!" выконваецца ў стылі "рэп" і скадаецца з 2 куплетаў і рэфрэна, які паўтараецца амаль бясконца. Галоўная думка кампазіцыі, як вынікае з назвы ды тэксту: "Калі нас шмат – нас не перамагчы!" Ніжэй прыводзім тэкст песні (адразу прыносім прабачынне, але тэкст залітараваны беларускімі графічнымі знакамі):

Фальсіфікацыям? – Ні!
Махінацыям? – Ні!
Понітіям? – Ні! Ні брэхні!
Юшчанка? – Так! Юшчанка? – Так!
Цэ наш прэзідэнт! Так! Так!

Рэф:
Разам нас багато! Нас не подолаты.
Разам нас багато! Нас не подолаты.

Мы не быдло, мы не козлы.
Мы Украіны донькі і сыны.
Зараз чы ніколы, годзе чэкаты
Разом нас богато, нас не подолаты!

Рэф.

У спалучэнні з адпаведным музычным матывам, які надоўга "засядае" у падсвядомасці, зусім не выклікае здзіўлення, што гэтая кампазіцыя стала такой папулярнай і прыдбала нават характарыстыку рэвалюцыйнага "гімна", словы якога ведала як маладошае пакаленне, так і людзі сталага ўзросту. Прычым яскравым сведчаннем усяго вышэйсказанага былі тэлевізійныя кадры, калі нейкая салідная бабуля пачала на мітынгу скандаваць: "Разам нас багато!".

Як зазначалася раней, да ліку агітацыйных хітоў можна залічыць не толькі новыя, але і старыя музычныя кампазіцыі, такія як "Вставай" (Океан Эльзи) або "Перемен" (В. Цоя) і нават "Оранжевое небо" з нейкага мультфільма савецкіх часоў.

Трэба адзначыць, што ў адрозненне ад расейскіх наймітаў, на Майдане не знайшлося месца "лішнім" музыкам: усе, хто выступаў, з'яўляліся сапраўднымі патрыётамі сваёй краіны, а таму музыкі і выкладваліся на канцэртах "напоўніцу".

Што ж датычыцца Беларусі, задаўшы пытанне сябрам рэдкалегіі і "Дзедзіча": "Якую кампазіцыю на сённяшні дзень вы бачыце ў ролі рэвалюцыйнага гімна Беларусі?", атрымалася, што на ролю такога сярод айчынных кампазіцый могуць прэтэндаваць: "Бяжы хлопец" (Крама), "Я нарадзіўся тут" (NRM) і "Паўстанцам" (Лявон Вольскі).

Такім чынам, засталося толькі дачакацца сваёй памаранчавай рэвалюцыі.

**С. Музыка**

# ДЗЕНЬ УСІХ ЗАКАХАНЫХ

*Ціхім каханнем к табе разгарацца...*
**М. Багдановіч**

ДЗЕНЬ СВЯТОГА ВАЛЯНЦІНА. ДЗЕНЬ, КАЛІ САМЫМ УЖЫВАЛЬНЫМ СЛОВАМ СТАНОВІЦЦА СЛОВА "КАХАЮ", САМЫМ ПРЫЕМНЫМ ПАДАРУНКАМ – КВЕТКІ, А САМЫМ РАСПАЎСЮДЖАНЫМ "ПАЛІВАМ" – СВЕЧКІ. РАМАНТЫКА...

Прапаную вам сёння, аднак, "цвярозы" (зразумела, на колькі гэта магчыма) падыход да выраза "каханне", а калі больш дакладна, "каханне з першага погляду". Ці знаёмы Вам гэты выраз? Пэўна, знаёмы. А вось што вынікае з гэтага сцвярджэння?

Напрыклад, калі закаханасць (глыбокае эмацыйнае прыцягненне, моцнае сардэчнае пачуццё) можа ўзнікнуць усяго за якія-небудзь 30-40 секундаў, значыць прыкладна за гэты ж час можа скласціся і дастаткова аб'ёмнае ўяўленне пра чалавека.

Часам яно бывае настолькі яркае, што здольна назаўсёды прыцягнуць або адштурхнуць чалавека. Дарэчы, гэтае першае ўяўленне звычайна аказваецца правільным і так укараняецца ў чалавечай свядомасці, што змяніць яго надта цяжка. Як такое можа быць? Усё гэта тлумачыцца навукова.

Чалавечае вока счытвае 80% інфармацыі, і толькі 20% прыходзіцца на ўсе астатнія пачуцці. Прычым успрыняццё вобраза і яго апрацоўка галаўным мозгам адбываецца з такой хуткасцю, што свядомасць нават не здольна дакладна вызначыць, якая менавіта рыса здалася такой сімпатычнай або такой агіднай.

Такім чынам, любы чалавек, проста азірнуўшыся навокал, практычна несвядома здольны за лічаныя секунды "вылічыць" у натоўпе ўсе свае сімпатыі і антыпатыі. А зробленыя такім чынам і зноўтакі несвядома вывады ні змяніць, ні выкінуць, ні выпаліць, ні вырубіць сякерай практычна немагчыма. Ды і, магчыма, не варта. Проста давярайце сабе: свайму сэрцу і сваёй інтуіцыі.

І няхай Вам пашчасціць сустрэць бурлівае і бязмернае, высокае і гарачае, глыбокае і кранальнае, прыгожае і шчырае каханне!

**Алена ДЗЕМІДЗЮК**




# А ЯК У НАС

ДЗЕНЬ СВЯТОГА ВАЛЯНЦІНА, АБО ДЗЕНЬ ЗАКАХАНЫХ, ДАЎНО ПАПУЛЯРНЫ Ў ЕЎРОПЕ І АМЕРЫЦЫ. ВА УСХОДНЮЮ ЕЎРОПУ ГЭТАЕ СВЯТА ПРЫЙШЛО ПАРАЎНАЛЬНА НЯДАЎНА. ІСНУЮЦЬ РОЗНЫЯ ДУМКІ НАКОНТ ПАХОДЖАННЯ СВЯТА ЗАКАХАНЫХ.

Згодна адной з версіяў, гэта каталіцкае свята, па іншых дадзеных яно мае выключна свецкае паходжанне. У дзень святога Валянціна закаханыя віншуюць адзін аднаго, адпраўляюць паштоўкі ў форме сэрца – так званыя "валянцінкі", робяць падарункі, часта ўпершыню прызнаюцца ў каханні, выказваюць свае пачуцці пры дапамозе прыемных сюрпрызаў. Ды няшмат хто ведае, што ў праваслаўнай традыцыі ёсць "адпаведнік" свята закаханых 14 лютага – дзень святых Пятра і Феўроніі.

Праваслаўныя хрысціяне адзначаюць "Дзень закаханых" 8 ліпеня (25 чэрвеня паводле юліянскага календара). У ролі заступнікаў кахання і шлюбнай вернасці Расейская праваслаўная царква шануе мурамскіх святых Пятра і Феўронію, што жылі на рубяжы XII-XIII стагоддзяў.

Згодна жыццю святых, князь Пётр сеў на трон у 1203 годзе. За колькі гадоў да гэтай падзеі ён захварэў на пракаху, ад якой ніхто не мог яго вылечыць. У сне князю адкрылася, што гэта можа зрабіць сялянская дзева Феўронія. Пётр пакахаў Феўронію за яе набожнасць, мудрасць і дабрыню і даў абяцанне ажаніцца з ёй пасля выздараўлення. Феўронія вылечыла князя і выйшла за яго.

Муж ды жонка пранеслі каханне праз многія выпрабаванні. Яны праславіліся набожнасцю і міласэрнасцю. Памерлі святыя Пётр і Феўронія ў адзін дзень і час 25 чэрвеня 1228 года (па старым стылі), прыняўшы перад гэтым манаскі пострыг пад імёнамі Давід і Ефрасіння. Целы святых былі пакладзены ў адну труну.

Прыкладна праз 300 гадоў пасля смерці Пётр і Феўронія былі прылічаны Расейскай праваслаўнай царквою да ліку святых. Гісторыя іх кахання падрабязна і калярова апісана ў вядомай старажытнай "Аповесці пра Пятра і Феўронію".

У праваслаўнай традыцыі "Дзень закаханых" адзначаецца не так шырока і пышна, як дзень святога Валянціна 14 лютага ў іншых хрысціян: без абмену сэрцамі, рамантычных вячэр і шумных увесяленняў.

У гэты дзень у праваслаўных веруючых прынята, перш за ўсё, наведваць храмы. У сваіх малітвах маладыя людзі просяць у Бога вялікага кахання, а людзі больш сталыя – сямейнай згоды.

Лічыцца таксама, што святыя Пётр і Феўронія даюць нябеснае блаславенне маладым.

**Алена МА¨ВАЯ**

## УЧАСТНИКАМ КВН ЗАПРЕЩЕНО ШУТИТЬ ПРО ЛУКАШЕНКО

После скандала в Барановичском государственном университете, где учащиеся во время игры КВН пошутили про Александра Лукашенко, студентам сообщили, что отныне все сценарии КВН перед выступлением будут проходить "идеологическую экспертизу" в администрации университета. Как стало известно российскому изданию "Газета", такая проверка введена во всех учебных заведениях Беларуси.

Борьба за соблюдение прав человека в белорусском варианте абсолютно не противоречит преследованию инакомыслящих. Его очередными жертвами стали руководители самого молодого в стране вуза – Барановичского государственного университета (БарГУ), открытого по указу Александра Лукашенко в июне 2004г. Недавно проректор по воспитательной работе Регина Венцель и ее заместитель Иван Кицун были уволены за то, что во время выступления в минском КВН студенты БарГУ разыграли сценку, содержащую попытку подсчитать размер зарплаты Александра Лукашенко:

– Александр Григорьевич, какая у вас зарплата?

– Так, щас посчитаю. Как президент страны получаю триста баксов. Как президент Национального олимпийского комитета – столько же. Да еще как главнокомандующему вооруженными силами доплачивают. Неплохо выходит…

Такая шутка прозвучала из уст участников команды КВН БарГУ во время первой игры нового года. Взрыва хохота в зале, однако, не последовало. Более того, по свидетельству очевидцев, в аудитории повисла гробовая тишина. А уже на следующий день в Барановичском университете началась "охота на ведьм". В течение суток был уволен И.Кицун, спустя несколько дней – Р.Венцель. Остальные руководители вуза получили выговоры.

Зампредседателя Брестского облисполкома Леонид Цуприк, который курирует учебные заведения, заявил "ГАЗЕТЕ", что проректор и ее заместитель понесли заслуженное наказание.

– Ответственные за воспитание молодежи люди должны были проверить программу и объяснить студентам, что неуважение к президенту, который столько сделал для города и его учебного заведения, недопустимо, – считает Л. Цуприк.

Кроме того, он полагает, что "эта выходка – вообще неуважение к собственной стране".

Уволенная Регина Венцель от комментариев отказывается, отмечая, впрочем, что о случившемся сожалеет. Студентам же под страхом отчисления из университета вообще запрещено общаться с представителями СМИ. Впрочем, один из учащихся, участвовавший в том злополучном КВН, согласился поделиться с "ГАЗЕТОЙ" своим мнением. Уверенный в том, что проректора уволили несправедливо, он рассказал:

– Шутка была совсем не обидная для Лукашенко. Мы только хотели подчеркнуть, что президент помимо основной работы возглавляет еще и Национальный олимпийский комитет. Но об этом все знают. Он и сам постоянно заявляет, что очень любит спорт. И что в этом крамольного?

По его словам, студентам сообщили, что отныне все сценарии КВН перед выступлением будут проходить "идеологическую экспертизу" в администрации университета. Появились и новые табу. Отныне студентам – участникам КВН вообще запрещено упоминать в своих шутках фамилию Лукашенко и слово "президент", а также имитировать его хрипловатый голос.

**charter97.org**

СМАЧНА ЕСЦІ!

# СТРАВЫ З ЯЕК, МАЛАКА, МУКІ І КРУП

СЁННЯ МЫ ПАЧЫНАЕМ ЗНАЁМІЦЬ ЧЫТАЧОЎ СА СТРАВАМІ, ЯКІЯ ГАТУЮЦЬ, ЯК КАЖУЦЬ, З ТАГО, ШТО ПАД РУКОЙ.

## ЯЙКІ, ФАРШЫРАВАНЫЯ ГРЫБАМІ

*8 яек, 20 г сушаных грыбоў, 1 цыбуліна, 1 ст. лыжка топленага масла, 2 ст. лыжкі маянэзу, 2 ст. лыжкі смятаны, 1 ст. лыжка соўсу тыпу «Паўднёвы», соль, зяленіва.*

Звараныя ўкрутую яйкі ачысціць ад шалупаек. Зняць нажом тупы канец яйка, выняць жаўток. Папярэдне замочаныя сушаныя грыбы зварыць, дробна пасячы, змяшаць з падсмажанай пакрышанай цыбуляй і расцёртымі жаўткамі.

Атрыманым фаршам запоўніць яйкі, накрыць зверху «шляпкамі» - зрэзаным бялком, заліць соўсам, які гатуецца з маянэзу, смятаны і соўсу тыпу «Паўднёвы».

Упрыгожыць зяленівам пятрушкі.

## ЯЙКІ, ФАРШЫРАВАНЫЯ СЕЛЯДЦОМ

*4 яйкі, 150 г селядца, 1 яблык, 0,5 цыбуліны, 40 г белага хлеба, 1 ч. лыжка воцату, 1 ст. лыжка алею, 0,3 шклянкі маянэзу, перац.*

Звараныя ўкрутую ачышчаныя яйкі разрэзаць напалам, выняць жаўткі. Селядзец вымачыць, аддзяліць філе, прапусціць яго праз мясарубку разам з яблыкамі, размочаным у вадзе або малацэ белым хлебам, цыбуляй, жаўткамі, запраўіць алеем, воцатам і перцам.

Палавінкі яечных бялкоў запоўніць падрыхтаваным фаршам такім чынам, каб надаць кожнай форму цэлага яйка. Фаршыраваныя яйкі паліць маянэзам.

## СЫРАКВАША

*0,6 л кіслага малака, 0,4 л малака, 2 ч. лыжкі цукру.*

Кіслае малако паставіць у нагрэтую духоўку на нядоўгі час. Затым выняць, зліць сыроватку. У масу, якая засталася, дадаць малако, цукар, асцярожна перамяшаць драўлянай лыжкай.

Прыгатаваную такім чынам сыраквашу падаць да бліноў.

## АМЛЕТ ПА-СЯЛЯНСКУ

*8 яек, 2 ст. лыжкі мукі, 1 шклянка малака, 100 г сала, 100 г сялянскай каўбасы, соль.*

Яйкі ўзбіць, дадаць муку, соль, добра перамяшаць.

Нарэзанае брусочкамі сала і кружкі каўбасы падсмажыць, заліць яечнай сумессю. Смажыць амлет спачатку на пліце, затым давесці да гатоўнасці ў духоўцы.

## АМЛЕТ БЕЛАРУСКІ

*8 яек, 0,5 шклянкі малака, 80 г сала, 1 цыбуліна, соль.*

Сала нарэзаць маленькімі кубікамі, падсквараць разам з нашаткаванай цыбуляй, заліць яйкамі, узбітымі з малаком з дабаўленнем солі.

Запячы ў духоўцы.

**Беларуская Палічка (http://knihi.com)**

(Працяг – у наступных нумарах)




Друкуючы рэцэпты разнастайных страў, мы забыліся запытацца ў вас, шаноўныя чытачы, ці ўсе словы, з ужываных у рубрыцы «Смачна есці!» вам зразумелыя. Выпраўляючы сваю памылку, мы друкуем маленькі слоўнік найбольш ужываных кулінарных тэрмінаў і просім не саромецца тэлефанаваць да нас, каб атрымаць тлумачэнне незразумелага вам выразу:

# СЛОЎНІК КУЛІНАРНЫХ ТЭРМІНАЎ

абіраць (бульбу) - чистить (картошку)
агрэст - крыжовник
ажыны - ежевика
воцат - уксус
вяндліна - ветчина
гарбата - чай
журавіны - клюква
згатаваць (вады) - вскипятить (воду)
імбрык - чайник
капуста - капуста, щи
кухар - повар
лядоўня - холодильник
накрыўка - крышка
падкухцік - поварёнок
парэчкі - смородина
патэльня - сковорода
печыва - печенье
разынкі - изюм
распусціць - растворить
рондаль - кастрюля
сочыва - варенье
спарыць (малако) - вскипятить
суніцы - земляника
трус - кролик
трускалкі - клубніка
узвар - компот
цытрына - лимон
шыпшына - шиповник
ялавічына - говядина

**Беларуская Палічка**

## УВАГА!!!

**БАМГА "Сузор'е" абвяшчае дадатковы набор карэспандэнтаў у склад рэдакцыі бюлетэня "Дзедзіч"**

**Студэнтаў, вучняў старэйшых класаў і ўсіх, хто жадае:**

**– Выказаць свае думкі,**
**– Навучыцца пісаць артыкулы,**
**– Зірнуць на акаляючы свет вокам журналіста,**
**– Стаць ля вытокаў стварэння новай моладзевай газеты,**

**просім звязацца з намі па тэл.: 23-68-02 з $18^{00}$ да $21^{00}$.**
**Маб.: (029) 660-57-41 (Дзмітрый), (029) 725-15-39 (Андрусь).**
**Таксама запрашаем да супрацоўніцтва мастакоў, карыкатурыстаў, фатографаў.**

БРЭСЦКАЯ ГАРАДСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ
**ПАРТЫЯ БНФ**
**распачынае новую агульнагарадскую кампанію "Разам за еўрапейскі дабрабыт".**

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ!**
**Разам мы:**
- Пабудуем сучасную эфектыўную гаспадарку;
- Усталюем парадак і вяршэнства Закона;
- Адстаім незалежнасць нашай Радзімы;
- Знішчым усеўладдзе і карупцыю чынавенства.

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ!**
**Ты зможаш:**
- Атрымаць кваліфікаваную прававую дапамогу ў складаных жыццёвых сітуацыях;
- Прайсці курсы палітычнай і грамадзянскай адукацыі ў Беларусі і за мяжой;
- Зрабіць кар'еру адукаванага і перспектыўнага палітыка;
- Навязаць кантакты з нашымі партнёрамі ў краінах Еўропы;
- Знайсці новых сяброў, з карысцю для сябе і для Бацькаўшчыны праводзіць вольны час.

**СТАНЬ СЯБРАМ ПАРТЫІ БНФ,** каб шчыра казаць сваім дзецям і ўнукам: "Я зрабіў усё, каб ваша жыццё было шчаслівым"!
**Як стаць сябрам партыі БНФ?**
**Тэлефануй: 23-68-02; (029) 641-20-98.**

## АБ'ЯВЫ

**Рэдакцыя бюлетэня "Дзедзіч" шукае распаўсюджвальнікаў выдання ў навучальных установах Берасця і вобласці. Тэл. (0162) 23-68-02.**

**Рэдакцыя бюлетэня «Дзедзіч» запрашае да супрацоўніцтва карэспандэнтаў з Берасця і гарадоў вобласці. Калі вы жадаеце выказаць свае думкі на нашых старонках, тэлефануйце: (0162) 23-68-02.**

АБ'ЯВЫ

# ПРАГРАМА ІМЯ ЛЭЙНА КІРКЛАНДА

**ПОЛЬСКА-АМЕРЫКАНСКІ ФОНД СВАБОДЫ І ФУНДАТАР ПРАГРАММЫ КІРКЛАНДА ПОЛЬСКА-АМЕРЫКАНСКАЯ КАМІСІЯ FULBRIGHTA АБВЯШЧАЮЦЬ АДКРЫТЫ КОНКУРС ДЛЯ КАНДЫДАТАЎ НА СТЫПЕНДЫЮ ІМ. LANE'A KIRKLANDA У 2005/2006 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ.**

**НАКІРУНКІ:**

- Эканоміка і кіраванне,
- Грамадскае кіраванне (урад і самакіраванне),
- Бізнэс,
- Права,
- Грамадскія навукі,
- Палітычныя навукі.

**КАНДЫДАТЫ:**

У 2005/2006 акадэмічным годзе прагрaма Кіркланда адрасавана асобам з Украіны, Беларусі, Расеі (Калінінградская вобл.), Літвы, Славакіі, Арменіі, Грузіі і Малдовы і прызначана для:

- Акадэмічных выкладчыкаў,
- Экспертаў, палітыкаў урадавах і няўрадавых арганізацый,
- Прадпрымальнікаў, мэнэджэраў,
- Лідэраў урадавых і няўрадавых арганізацый,
- Журналістаў.

**КРЫТЭРЫІ:**

- Грамадзянства і сталае пражыванне ў адной з 8 пералічаных краінаў,
- Поўная вышэйшая адукацыя,
- Добрае веданне польскай мовы,
- Прафесійная падрыхтоўка – мінімум 2 гады.

Першынство маюць:

- Асобы узростам да 35 гадоў,
- Кандыдаты, якія актыўна дзейнічаюць у сваіх накірунках.

**ПРЫНЦЫПЫ ЗАЛІЧЭННЯ:**

- Адкрыты конкурс у Інтэрнэце і іншых СМІ
- Выбіраюцца каля 50 найлепшых кандыдатаў у ходзе 3 этапаў:

I этап - адпаведнасць крытэрыям,

II этап - ацэнка стыпендыйных праектаў кандыдатаў,

III этап - прфесійнае субяседаванне.

Асобы, запрошаныя да III этапа будуць праінфармаваныя праз e-mail або тэлефон. Звесткі аб апошніх выніках конкурса высылаюцца поштай у 2-й палове траўня.

**НЕАБХОДНЫЯ ДАКУМЕНТЫ:**

1. Фармуляр:

a. Індывідуальная анкета і фотаздымак,

b. Матывацыйны ліст.

2. Curriculum Vitae (CV) і спіс публікацый.

3. 2 рэкамендацыйныя лісты, высланыя асобамі, якія рэкамендуюць кандыдатаў.

4. Копія дыплома аб заканчэнні універсітэта.

**ФІНАНСАВЫЯ УМОВЫ:**

Стыпендыя: 9 месяцаў па 1750 польскіх злотых. Кампенсуюцца наступныя выдаткі: выдаткі на адукацыю, пражыванне, страхоўка, праезд да Польшы, набыцце матэрыялаў і навуковай літаратуры. Камputары і прынтары, пазычаныя стыпендыятам, могуць перайсці ва ўласнасць студэнтаў пасля поўнага выканання ўмоў атрымання стыпендыі.

**ПАДАЧА ЗАЯВАК:**

Арыгіналы дакументаў і рэкамендацыйных лістоў неабходна выслаць поштай на адрас камісіі Fulbrighta: Polsko-Amerykanska Komisja Fulbrighta, ul. Nowy Swiat 4, 00-497 Warszawa – Polska.

Таксама копію заявак можна выслаць электронай поштай: u.moczydlowska@fulbright.edu.pl ці fulbright@fulbright.edu.pl.

**Апошні тэрмін падачы заявак:** (фармуляр, C.V. спіс публікацый і рэкамендацыі): 15 сакавіка 2005.

Фармуляры можна заказаць поштай, праз e-mail або праз тэлефон: (48-22) 628-7950; 625-6932; 625-6978.

Таксама фармуляр можна знайсці на інтэрнэт-старонцы: Камісіі Fulbrighta

http://www.fulbright.edu.pl ці

www.programkirklanda.engo.pl

**Dzedzich week-news**




# У НОВЫМ "ARCHE"

**№1 (2005Г.)**

**Аляксандр БАТУРА** "Тры высновы з аранжавай рэвалюцыі"

**Міхась ТЫЧЫНА** "Згаданы Быкаў"

**Дзмітрый ПАДБЯРЭСКІ** "Кніга жыцця і смерці Уладзіміра Мулявіна"

**Пётра РУДКОЎСКІ** "Панская Польшча і бяспанская Беларусь"

**Віктар ЛЕАНЕНЯ** "Гісторыя меліярацыі Беларусі"

**Андрэй ХАДАНОВІЧ** "Неба над Берлінам"

Апавяданні Міленкі Ергавіч у перакладзе Сяргея Шупы.

А таксама падборка тэкстаў **Віталя Сіліцкага, Збігнева Бжэзінскага, Роберта Кагана, Фрэнсіса Фукуямы** ды іншых аўтараў пра замежную палітыку ЗША пасля пераабрання Дж.Буша.

**Калі вы жадаеце набыць часопіс "ARCHE", тэлефануйце:** (0162) 23-68-02 (з 12-00 да 17-00).

**Кошт 1 асобніка:** 3000 руб.

## Фонд «Дзедзіч» шукае добраахвотніка

# WEB-дызайнера

**(з сярэднім узроўнем валодання WEB-праграмаваннем), які б дапамагаў нам у абнаўленні і ўдасканаленні сайта арганізацыі: http//:www.dzedzich.org.**

**На жаль, мы не можам аплаціць гэтую працу, але каву, гарбату і добрую сяброўскую атмасферу гарантуем.**

**Тэл.: 23-68-02, (029) 660-57-41.**

# Беларуская палічка запрашае

**Сябры! Запрашаем Вас наведаць найбуйнейшую беларускую электронную бібліятэку!**

**Адрас "беларускай палічкі": www.knihi.com.**

Тут Вы знойдзеце творы беларускіх пісьменнікаў, паэзію, казкі, пераклады вядомых сусветных літаратараў, рэлігійную і філасофскую літаратуру, гістарычныя даследаванні і шмат іншага. Наведвайце нашую віртуальную бібліятэку часцей – мы абнаўляемся штодзённа.

**Усе пажаданні і прапановы чытачоў улічваюцца!**

## Шаноўны чытач!

**Каб зрабіць наш бюлетэнь больш цікавым і прывабным для цябе і тваіх сяброў, мы звяртаемся да цябе з просьбай адказаць на гэтае пытанне і даслаць адказ на адрас: 224000, г. Берасце, вул. Кірава, д. 67, кв. 3.**

Будзем вельмі ўдзячныя за тваю дапамогу ў стварэнні цікавай сучаснай газеты, а для лянівых паведамляем, што сярод тых, хто дашле нам свае заўвагі, мы разыграем 3 аўдыёкасеты з музыкай беларускіх гуртоў.

Чаго не хапае на старонках "Дзедзіча", якую інфармацыю ты хацеў бы атрымліваць праз яго:

## Увага!

Працягваецца бясплатная падпіска

**на Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь "Дзедзіч" для асоб, што не жывуць у г. Берасці.**

Калі ты жадаеш атрымліваць яго больш стала і аператыўна, запоўні гэты купон і дашлі яго на адрас:

**224000, г.Берасце, вул. Кірава, д. 67, кв. 3.**

Чаму ты вырашыў падпісацца:

Прозвішча:

Імя:

Імя па бацьку:

Паштовы адрас:

Тэлефон:

## ДАРЭЧЫ

Сабраліся 4 магільшчыкі. Адзін кажа:
- Давайце закопваць памерлых без труны - дрэва сэканомім.
Другі:
- Давайце закопваць іх стоячы - менш капаць прыйдзецца.
Трэці:
- Давайце напалову закопваць - помнік не трэба будзе ставіць.
Чацвёрты:
- А калі яны яшчэ за рукі возьмуцца - прыкольная агароджа атрымаецца!

***

Хлопец гуляе з дзяўчынай. Яна:
- Ведаеш, мама сказала, каб я адказвала "Не", што б ты у мяне ні спытаў.
- Добра, давай праверым. Ты не будзеш пярэчыць, калі я цябе пацалую?
- Не.
І ён смачна цалуе яе ўзасос.
- А ты не пакрыўдзішся, калі я захачу пагладзіць цябе па попцы?
- Н-не...
І ён запускае руку ёй пад спадніцу.
- Хм... Ведаеш, калі ты і далей будзеш слухацца мамачку, мы з табою файна збавім час.

***

Сям'я ў поўным складзе сядзіць ля тэлевізара. Звоніць тэлефон. Вовачка бярэ слухаўку:
- Алё? Не, Маша не можа падыйсці, у яе рот заняты. Калі я скончу, яна вам ператэлефануе.
Кладзе слухаўку і тлумачыць абалдзелым бацькам: – Не туды патрапілі.

***

Зборная Расеі па футболе ізноў апынулася ў крызысе, прычым у вельмі глыбокай.

***

Дурні вучацца на сваіх памылках, разумныя на чужых, а мудрыя глядзяць на іх і не спяшаючыся п'юць піва.

***

Сядзяць Пецька з Васілём Іванычам на ганку, а побач праходзяць дзеўкі.
Адна з іх гаворыць:
- Глядзіце які арол сядзіць. А другі так сабе - поўнае г..., карацей кажучы.
Пецька:
- Ну Васіль Іваныч, я паляцеў.
- Паляціш, калі цябе рыдлёўкай падкінуць.

***

Пабудавалі ў ЗША чарговы суперкампутар. Задалі яму задачу прадказання будучыні. Паклікалі прэзідэнта Буша - каб паказаць.
Буш падумаў-пакумекаў і спытаў:
- Калі пачнецца 3-я сусветная вайна?
- У 2ххх годзе.
Буш думае, чаго б яшчэ спытаць.
- А колькі будзе каштаваць кока-кола пасля 3-й сусветнай вайны?
- Кока-кола будзе каштаваць пяцьдзесят капеек.

***

У гарэлкі ёсць адзін недахоп - гэта яе недахоп!

Даішнік спыняе чорнага мерына з таніраванымі шыбамі за перавышэнне хуткасці. Адчыняецца акно, а там браток, адвярнуўшыся, дзесьці корпаецца, затым рэзка паварочваецца і крычыць:
- ГАЎ!!!!!!!!
Даішнік, не чакаўшы гэтага, адскоквае і вылупляе вочы. Браток пасміхаецца і кажа:
- Не баісь, - і, паказваючы на рамень бяспекі, - бачыш, я прывязаны.

***

- Не хвалюйцеся! - супакойвае доктар маладую жанчыну, у якой толькі што прыняў роды ў ліфце. - Мне распавядалі, што ў мінулым годзе адна жанчына нарадзіла проста на аўтобусным прыпынку.
- Доктар, гэта была я...

***

Жонка збіраецца ехаць у адпачынак на курорт і пытае мужа, што яму адтуль прывезці. Муж:
- Вязі, што хочаш, зараз усё вылечваюць.

***

- Як называць хлопца, які цягне дзяўчыну ў ложак на другім спатканні?
- Тормаз!

***

Жывёл, якіх вельмі мала, занеслі ў Чырвоную кнігу, а якіх вельмі многа... у Кнігу аб смачнай і здаровай ежы.

***

Некаторыя абаненты МТС да гэтага часу мяркуюць, што "Пошук сеткі" - гэта лагатып іх апаратара.

***

Грукаюць тры бландзінкі на тым свеце ў Жамчужную браму. Святы Пётр ім адказвае, што, маўляў, перад тым, як трапіць у рай, трэба адказаць на якое-небудзь просценькае пытанне з Катэхізісу.
- Вось, напрыклад, што такое Вялікдзень?
Першая бландзінка:
- Гэта што, восенню, калі індычку смажаць і аб'ядаюцца пасля цэлы дзень? Так?
- Дрэнна, дрэнна - ідзі сабе, - адказвае Святы Пётр.
Другая бландзінка прапаноўвае свой варыянт:
- А я ведаю, а я ведаю! Гэта ўзімку, калі ёлкі ставяць і падарункі адзін аднаму дораць!!!
- Пайшла прэч, - злуецца Святы Пётр. І, звяртаючыся да трэцяй, гаворыць:
- Давай цяпер ты.
- Вялікдзень, - гаворыць трэцяя, - гэта калі Ісус і яго вучні святкавалі габрэйскую Пейсах, і Ісус пераўтварыў віно ў кроў, а Іуда яму здрадзіў, і калі яны спалі ў саду, прыйшлі рымляне і яго арыштавалі, а пасля яго білі і распялі на крыжы, а пасля яго з крыжа знялі, і паклалі ў пячору, а уваход у пячору завалілі камянём, а потым ён уваскрос...
- Ну і ну, - усё, што здолеў сказаць уражаны Пётр.
А бландзінка працягвае:
- ... і цяпер раз у год гэты камень адсоўваюць, і калі ён вылезе і ўбачыць свой цень - то зіма працягваецца яшчэ шэсць тыдняў...

***

На міжнароднай выставе ў Дэтройце аўтамабіль «Таўрыя» заняў першае месца ў намінацыі «Аўтамабіль, якога лепш бы і не было».

Удача пасміхаецца смелым..., а потым доўга рагоча з іх.

***

- Микола, ты що свою домашню страницю на домен "ru" засував?
- А що?
- Так це ж "Раша"!
- От, гади! А я думав, Рідна Україна!

***

Растраповіч, два-траповіч, тры-траповіч, чатыры-траповіч, пяць-траповіч...
Шастаковіч!

***

- Вы тут весяліцеся, а ў мяне папугайчык памёр!
- Што, рэальна, ці што?!
- Не, блін! Са спецэфектамі!

***

Сабралася сям'я шпалеры клеіць. Жонка мужу кажа:
- Схадзі да суседзяў знізу - яны рамонт нядаўна рабілі, кватэра ў іх такая ж. Спытай, колькі рулонаў куплялі.
¨н пайшоў, яму сказалі: - Шаснаццаць.
Купілі шпалеры, пачалі клеіць. 6 рулонаў засталося.
Муж злосны, зноўку ідзе да іх. Кажа:
- Вам што, сволачы такія - сказаць праўду цяжка было? У нас 6 рулонаў засталося!
- І у нас столькі ж засталося.

***

Тэлефонны званок у інтэрнаце:
- Прабачце, а Жану можна?
- А гэта Вы ў яе спытайце.

***

Сучасная філасофская пастаноўка праблемы курыцы і яйка зводзіцца да пытання: ці пладзяцца курыцы шляхам адкладання яек, ці яйкі пладзяцца шляхам вылуплення курыц.

***

Учора па шматлікіх просьбах адпачывальнікаў арганізавалі свята з конкурсамі. Спачатку хацелі спаборнічаць па-сапраўднаму, без дурняў, але потым перадумалі. Два конкурсы. Хто вып'е больш гарэлкі і хто страшней скрывіць твар.
Першы конкурс з-за недахопу інвентара выйграў электраманцёр Каляныч, які па недагляду адміністрацыі ўхітрыўся выступіць першым. Другі конкурс безагаворачна выйграў вадаправодчык Мітрыч, калі яму сказалі, што на першы конкурс ён спазніўся.

***

- Як пладзяцца непрыгожыя дзяўчыны?
- Дык, уласна кажучы, выпадкова... Па-п'яні.

***

2 Расейскія аматары футболу:
- Ты за каго будзеш балець на чэмпіянаце?
- За нашых, канешне!
- А потым?

***

Насустрач грузіну ідуць 2 сімпатычныя дзяўчыны.
Грузін:
- Дэвушкі, я вас хачу.
- А мы не!
- Ну мынет, так мынет!

№1 ДЗЕДЗІЧ
ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
люты 2005
ПРЫ ВЫКАРЫСТАННІ МАТЭРЫЯЛАЎ БЮЛЕТЭНЯ СПАСЫЛКІ НА КРЫНІЦУ АБАВЯЗКОВЫЯ
Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі

**Заснавальнік:** Ініцыятыўная група моладзі
**Распаўсюджваецца бясплатна** на правах унутранага карыстання
**Падпісана ў друк:** 17.02.2005 у 18[00]
**Наклад:** 299 асобнікаў. Надрукавана на ксераксе.

**Галоўны рэдактар:** Дзмітрый Шыманскі.
**Рэдакцыйная калегія:** А. Лена, М. Ікола, Д. Змітрый, М. Арыя, С. Яргей, С. Яржук, Ю. Рась.
**Адказны сакратар:** А. Ндрусь. **Вёрстка:** Б. Дэпеша

**Кантактны тэлефон:** (0162) 23-68-02, (029) 660-57-41, (029) 725-15-39
**E-mail:** dzedzich@dzedzich.org, інтэрнэт: www.dzedzich.org